*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 КРАСАВІКА 2009 г. СУБОТА № 63 (26421)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Беларусь праводзіць незалежную шматвектарную знешнюю палітыку

**Беларусь адкрыта для канструктыўнага і шматпланавага супрацоўніцтва з дзяржавамі або аб'яднаннямі дзяржаў незалежна ад іх геаграфічнага становішча. Аб гэтым 3 красавіка заявіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, прымаючы даверчыя граматы паслоў дзесяці дзяржаў.**

Галоўным складальнікам поспеху такога супрацоўніцтва, на думку Прэзідэнта, была і застаецца сустрэчная гатоўнасць партнёраў да раўнапраўных і паважлівых двухбаковых адносінаў.

Звяртаючыся да ўсіх новых кіраўнікоў дыпламатычных місій у Беларусі, Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею на тое, што ім удасца сфарміраваць і данесці да сваіх краін аб'ектыўнае і непрадузятае разуменне Беларусі — маладой суверэннай дзяржавы, якая праводзіць незалежную, шматвектарную знешнюю палітыку і адыгрывае ключавую ролю ў забеспячэнні бяспекі і стабільнасці на еўрапейскім кантыненце, краіны з багатай культурай і гісторыяй, адукаваным і працавітым народам, эканомікай і сацыяльнай сферай, што дынамічна развіваюцца.

«Новы пасол у краіне — гэта заўсёды свежы погляд на перспектывы і нявыкарыстаныя рэзервы двухбаковых адносінаў. Мы гатовы аказваць усямерную дапамогу і падтрымку ўсім вашым намаганням па развіцці і паглыбленні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзяржаў, якія вы тут прадстаўляеце», — сказаў Прэзідэнт.

Прымаючы даверчыя граматы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Італьянскай Рэспублікі ў Беларусі Джуліо Прыдцоні, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь высока цэніць падтрымку Італіі ў працэсе пашырэння супрацоўніцтва ЕС з яго ўсходнімі суседзямі, у тым ліку і з нашай краінай.

«Асабліва ўдзячны грамадзянам Італіі за іх актыўны ўдзел у праектах па аздараўленні беларускіх дзяцей, а таксама за дапамогу ў перадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС», — адзначыў ён.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў зацікаўленасць у далейшай актывізацыі беларуска-італьянскага ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай і крэдытна-інвестыцыйнай сферах, у галіне высокіх тэхналогій, навукова-тэхнічнага і культурнага супрацоўніцтва.

Адносіны з В'етнамам — адзін з прыярытэтаў беларускай знешняй палітыкі ў Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне, адзначыў Прэзідэнт, прымаючы даверчыя граматы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам у Беларусі Данг Хыу Чана. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь і В'етнам маюць агульныя падыходы да ключавых міжнародных праблем. Многае збліжае нашы краіны і ў сацыяльна-эканамічнай сферы, у першую чаргу сацыяльна арыентаваныя мадэлі развіцця, выбраныя народамі. «Паміж нашымі краінамі дакладна вызначаны шляхі ўзаемадзеяння», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Вітаючы новага пасла Рэспублікі Індыя ў Беларусі Рамеша Чандэра, кіраўнік дзяржавы адзначыў высокую ступень узаемаразумення, што ўстанавілася як на ўзроўні кіраўніцтва, так і паміж простымі людзьмі дзвюх краін. "Як Прэзідэнт Беларусі я надаю асаблівае значэнне ўмацаванню стабільных і ўзаемавыгадных адносінаў з Індыяй, якая з'яўляецца для нас адным з важнейшых гандлёва-эканамічных партнёраў у Азіі», — падкрэсліў ён. «Мы ганарымся нашымі адносінамі, нашым супрацоўніцтвам з Індыяй — гігáнцкай і адной з найбагацейшых краін, з якой у нас захоўваюцца добрыя адносіны яшчэ з савецкіх часоў», — сказаў Прэзідэнт. Ён выказаў упэўненасць у павелічэнні дынамікі беларуска-індыйскіх сувязяў.

Звяртаючыся да Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Ісламскай Рэспублікі Афганістан у Расійскай Федэрацыі і Беларусі па сумяшчальніцтве Залмая Азіза, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь выступае за больш хуткае ўрэгуляванне сітуацыі ў Афганістане пры вырашальнай ролі ААН у гэтым працэсе. «Мы вельмі перажываем за тую сітуацыю, у якой апынулася ваша дзяржава. Перакананы, што ў бліжэйшы час афганскі народ займе дастойнае месца ў садружнасці нацый. Мы вельмі гэтага хацелі б», — сказаў ён. Для аднаўлення афганскай эканомікі беларускія прадпрыемствы гатовы пашырыць асартымент прадукцыі, што пастаўляецца, дадаў Прэзідэнт.

Прымаючы даверчыя граматы новых паслоў Кувейта, Намібіі і Бангладэш, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь гатова да актывізацыі супрацоўніцтва з гэтымі краінамі ў самых розных сферах. «Адлегласць, што раздзяляе нашы краіны, не можа лічыцца перашкодай для гарманічнага развіцця адносінаў», — заўважыў беларускі лідар.

Паводле слоў Прэзідэнта, Беларусь можа прапанаваць сваю прадукцыю, якая карыстаецца вялікім попытам у свеце, асабліва дзякуючы аптымальным суадносінам цаны і якасці.

У бліжэйшы час Беларусь плануе наведаць з афіцыйным візітам эмір Катара. На думку Аляксандра Лукашэнкі, перагаворы на вышэйшым узроўні выведуць кантакты паміж дзвюма краінамі на якасна новую ступень. «Мы акажам усялякае садзейнічанне ў падрыхтоўцы гэтага візіту. Спадзяюся, што мы зможам абмеркаваць праблемы і перспектывы нашага супрацоўніцтва», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы, прымаючы даверчыя граматы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Катара ў Расіі і Беларусі па сумяшчальніцтве Ахмада Сейфа аль-Меададзі.

Беларусі і Ізраілю неабходна больш дынамічна, збалансавана нарошчваць гандаль, паглыбляць узаемавыгаднае інвестыцыйнае супрацоўніцтва, а таксама ўмацоўваць кантакты ў сферы высокіх тэхналогій. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што новы пасол Ізраіля ў Беларусі Эдуард Шапіра будзе адыгрываць актыўную стваральную ролю ў развіцці гэтых напрамкаў двухбаковага супрацоўніцтва.

Прэзідэнт адзначыў, што ў бліжэйшы час будзе зроблены шэраг захадаў па ўмацаванні кантактаў з нашымі былымі суайчыннікамі, якія жывуць у Ізраілі.

Прымаючы даверчыя граматы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Харватыя ў Расіі і Беларусі па сумяшчальніцтве Небайшы Кохаравіча, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што абодва бакі маюць значны патэнцыял для развіцця шырокага комплексу двухбаковых адносінаў, асабліва ў эканамічнай сферы. «У бліжэйшы час неабходна больш поўна рэалізаваць існуючыя магчымасці», — сказаў Прэзідэнт.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

**Актуальную информацию о неиспользуемых объектах государственной собственности Вы найдете:**

**Госкомимущество** - г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, тел. 284 86 49, www.gki.gov.by

А также в регионах:

Брестоблимущество - г. Брест, ул. Ленина,11, тел. 23 44 06, www.brest-region.by

Витебскоблимущество - г.Витебск, ул. Правды, 38, тел. 47 60 96, www.vitebsk-region.gov.by

Гомельоблимущество - г. Гомель, пр. Ленина, 3, тел. 70 38 49, www.gomel-region.by

Гродноблимущество - г. Гродно, ул. 17 сентября, 39, тел. 74 53 82, www.region.grodno.by

Могилевоблимущество - г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 31 11 85, www.region.mogilev.by

Минскоблгосимущество - г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. 224 57 09, www.minsk-region.gov.by

Минскгоримущество - г. Минск, пр. Независимости, 8, тел. 200 20 89, www.minsk.gov.by

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.04.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 803,00 |
| ▲ 1 еўра | 3 763,87 |
| 1 латвійскі лат | 5 308,21 |
| 1 літоўскі літ | 1 089,94 |
| 1 чэшская крона | 141,45 |
| 1 польскі злоты | 846,24 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 83,90 |
| 1 украінская грыўня | 348,20 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 33,4095 |
| 10 UAH | 41,5025 |
| 1000 BYR | 11,8264 |
| EUR | 44,8523 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

**Беларусь вядзе перагаворы з Ашчадным банкам Расіі аб прадастаўленні крэдыту ў $2 млрд**

З прапановамі аб крэдытнай падтрымцы Беларусь таксама звярнулася да іншых банкаў Расіі — ЗЭБ, Расбанка і ЗГБ.

**БЕЛТА.**




Фота БЕЛТА.

*Леснікі ДЛГУ «Брэсцкі лясгас» **Рыгор ШУМІЛА** і **Уладзімір ДАРАШЭНКА** нарыхтоўваюць бярозавы сок. Сабраны сок лясгас адпраўляе на перапрацоўку на прадпрыемствы Брэстчыны, а таксама прадае насельніцтву. Усяго за мінулы год у вобласці лясгасам сабрана больш чым 6100 тон соку.*

## УНАЧЫ ПАДМАРОЖВАЕ, А ЎДЗЕНЬ — ДА ПЛЮС 20

**У выхадныя тэрыторыя Беларусі трапіць у зону павышанага ціску, таму ападкаў не будзе, толькі ў суботу атмасферны фронт з боку Балтыйскага мора прынясе да нас невялікія кароткачасовыя дажджы ў Віцебскую і Магілёўскую вобласці, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

Вецер паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра сёння ўдзень 6—11, у Брэсцкай вобласці — да плюс 16 градусаў. У нядзелю будзе таксама сонечна, толькі ўдзень у Гродзенскай вобласці ёсць верагоднасць кароткачасовых ападкаў. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю ад мінус 4 да плюс 3, а па паўночным усходзе пры праясненнях да 5—7 марозу. Удзень сонца прагрэе паветра да 9—16, па паўднёвым захадзе — плюс 18, у Брэсцкай вобласці месцамі да 20 цяпла.

Ужо ў панядзелак пад уплывам атмасферных франтоў у асобных раёнах краіны пройдзе кароткачасовы дождж. Тэмпература паветра ўдзень 8—15, па поўдні — да 18 цяпла. Згодна з папярэднімі прагнозамі, у сярэдзіне наступнага тыдня паўночныя вятры прынясуць да нас невялікае пахаладанне. Таму ў сераду ўначы тэмпература паветра знізіцца да 0—7 марозу, толькі па паўднёвым захадзе да 2 цяпла, удзень тэмпература будзе вагацца ад плюс 2 па паўночным усходзе да 12 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## У ГОРКАХ З БАНКАМАТА СКРАЛІ ВЯЛІКІЯ ГРОШЫ

**Больш за 13 мільёнаў беларускіх рублёў і каля 1,5 тысячы долараў забралі зладзеі з банкамата, які месціцца ў краме на вуліцы Вакзальнай у раённым цэнтры Горкі.**

Невядомыя асобы праніклі ў фае крамы ўначы і адчынілі банкамат з адваротнага боку. Злачынства было ўчынена каля 4-х гадзін раніцы, у паўгадзінны прамежак часу. Міліцыя шукае злачынцаў, распачата крымінальная справа.

**Алена КАЗЛОВА.**

## Зянон ЛОМАЦЬ: «Я ЗАКЛІКАЮ ЎСІХ ПРАЦАВАЦЬ У ПРАВАВЫМ ПОЛІ»

*Учора прайшла «прамая лінія» для жыхароў Мінскай вобласці са старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю*

**— Добры дзень, Зянон Кузьміч! Вам тэлефануе Наталля Анатольеўна з г. п. Старобін Салігорскага раёна. Наш дом быў здадзены ў снежні мінулага года. У ім 12 кватэр. Кожная мае індывідуальнае газавае ацяпленне. Але выцяжкі не працуюць, і чадны газ трапляе ў кватэру. Газ мы ўключыць, вядома ж не можам, цяпла ў доме няма. Таму пераехаць у кватэру таксама не можам. У нас ужо была камісія. Яна прапанавала нам рэканструяваць катлы за наш кошт, але гэта ж пытанне не вырашыць, выцяжкі ўсё роўна працаваць не будуць.**

— У нас тут у зале ёсць старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама. Ён запісаў ваш нумар тэлефона. Літаральна заўтра ці сёння пасля абеду ў вас будуць спецыялісты.

**— Зянон Кузьміч, добры дзень! Вам тэлефануе Людміла Мікалаеўна з Барысава. Мы жывём недалёка ад шпіталя, каля якога ёсць стаянка. Але яна платная, таму машыны многія туды не ставяць. І цяпер ужо наша вуліца ператварылася ў стаянку. Мы колькі ні звярталіся да нашых мэраў, і былога, і цяперашняга, але нічога не мяняецца. А вось каля ўезда ў шпіталь ёсць пляцоўка, яе трэба толькі крыху акультурыць...**

— А грошы каму ідуць за платную стаянку?

**— Мы не ведаем.**

— З аблвыканкама да вас пад'едуць і разбяруцца.

**— Добры дзень. Вас непакоіць Ірына Міхайлаўна, Клецк. У маі 2005 года мы пачалі будаваць кааператыўны дом. Па праекце павінны былі здаць праз 10,5 месяцаў, але дом не здадзены да гэтага часу. Будаўніцтва зацягваецца, і ўсё за наш кошт.**

— З камітэта да вас прыедуць і разбяруцца.

**— Дзякуй вам.**

**— Вас непакоіць жыхарка Маладзечна Святлана Уладзіміраўна. Мы ўжо тры гады спрабуем спыніць незаконную дзейнасць на нашым прадпрыемстве, заснавальнікамі якога мы з'яўляемся. Уся незаконная дзейнасць ідзе пад кіраўніцтвам дырэктара. З'яўляючыся дырэктарам, ён не заплаціў 150 млн рублёў падаткаў.**

— Святлана Уладзіміраўна, фінансавая міліцыя вобласці займаецца вашым дырэктарам. Узбуджана крымінальная справа. На вас выйдуць працаўнікі фінансавай міліцыі камітэта дзяржкантролю і будуць вам удзячныя за дадатковую інфармацыю.

**— Гэта справа спынялася ўжо некалькі разоў. Будынак майстэрні ён здаў у арэнду для таго, каб мы не маглі яго кантраляваць.**

— Ваш тэлефон пазначылі, Святлана Уладзіміраўна. З вамі сустрэнуцца, і ўсё будзе праверана. Дамовіліся?

**— Дзякуй, Зянон Кузьміч.**

**— Я жыву ў пасёлку Чысць Маладзечанскага раёна. Наш пасёлак пабудаваны ў 1955-56 гадах. З таго часу не было ніводнага рамонту жылля. Мы звярталіся ў розныя інстанцыі. Вось перада мною паперы ляжаць. Нам было абяцана, што ў 2008 годзе будзе капітальны рамонт, але нічога не адрамантавалі. Зверху пафарбуюць, а ўнутры ніхто не глядзіць.**

— А якія дамы?

**— Двухпавярховыя. Дзесяць дамоў. Яны ў нас старыя, з драўлянымі перакрыццямі, Мы баімся, што абваляцца дахі. Бярвёнамі прыходзілася столь падпіраць.**

— Кватэры прыватызаваныя?

**— Хтосьці выкупіў, а хтосьці не. Дапамажыце, калі ласка. А то адмахваюцца і адкладваюць. Зрабілі б адзін раз і ўсё.**

— Вырашым гэта пытанне. (Да залы): Трэба вырашаць, а то пасля што здарыцца, будзеце рукамі размахваць.

**— Добры дзень. Наталля Анатольеўна, Салігорск. Я працую цырульнікам у Доме быту. Вы ведаеце, у нас вельмі маленькі заробак. Зарплата ў мяне здзельная, 70-80 тыс. рублёў. У той час як прыбіральшчыца атрымоўвае 300 тыс. рублёў. Як можа цырульнік атрымоўваць менш, чым прыбіральшчыца? У мяне стаж 15 гадоў.**

— А колькі каштуе ў вас мужчынская стрыжка?

**— Зараз 11 000 рублёў. 12 % ад сумы ідзе на зарплату. Вакол нас яшчэ 15 цырульняў. У асноўным прыватных.**

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 7 МАЯ 2009 ГОДА

**Открытое акционерное общество «МАПИД» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартир без отделки в доме № 92 по ул. Тимирязева в г. Минске (3 подъезд)**

| № лота | Наименование объекта: № квартиры | количество комнат | этаж | подъезд | Площадь, кв.м: общая | жилая | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 69 | 4 | 1 | 3 | 90,6 | 59,1 | 227 410 000 | 22 741 000 |
| 2 | 70 | 3 | 1 | 3 | 70,9 | 43,3 | 177 960 000 | 17 796 000 |
| 3 | 71 | 2 | 1 | 3 | 55,1 | 31,2 | 138 310 000 | 13 831 000 |
| 4 | 72 | 2 | 1 | 3 | 66,4 | 29,7 | 166 670 000 | 16 667 000 |
| 5 | 73 | 4 | 2 | 3 | 90,0 | 58,9 | 225 900 000 | 22 590 000 |
| 6 | 74 | 3 | 2 | 3 | 70,9 | 43,3 | 177 960 000 | 17 796 000 |
| 7 | 75 | 2 | 2 | 3 | 55,0 | 31,0 | 138 050 000 | 13 805 000 |
| 8 | 76 | 3 | 2 | 3 | 76,1 | 46,5 | 191 020 000 | 19 102 000 |
| 9 | 77 | 4 | 3 | 3 | 89,9 | 58,7 | 225 650 000 | 22 565 000 |
| 10 | 78 | 3 | 3 | 3 | 70,8 | 43,2 | 177 710 000 | 17 771 000 |
| 11 | 79 | 2 | 3 | 3 | 55,0 | 31,1 | 138 050 000 | 13 805 000 |
| 12 | 80 | 3 | 3 | 3 | 76,4 | 46,8 | 191 770 000 | 19 177 000 |
| 13 | 81 | 4 | 4 | 3 | 90,2 | 59,0 | 226 410 000 | 22 641 000 |
| 14 | 82 | 3 | 4 | 3 | 70,8 | 43,3 | 177 710 000 | 17 771 000 |
| 15 | 83 | 2 | 4 | 3 | 55,0 | 31,2 | 138 050 000 | 13 805 000 |
| 16 | 84 | 3 | 4 | 3 | 76,2 | 46,6 | 191 270 000 | 19 127 000 |
| 17 | 85 | 4 | 5 | 3 | 90,0 | 58,9 | 225 900 000 | 22 590 000 |
| 18 | 86 | 3 | 5 | 3 | 70,7 | 43,2 | 177 460 000 | 17 746 000 |
| 19 | 87 | 2 | 5 | 3 | 54,9 | 31,0 | 137 800 000 | 13 780 000 |
| 20 | 88 | 3 | 5 | 3 | 76,2 | 46,6 | 191 270 000 | 19 127 000 |
| 21 | 89 | 4 | 6 | 3 | 90,1 | 58,8 | 226 160 000 | 22 616 000 |
| 22 | 90 | 3 | 6 | 3 | 70,7 | 43,3 | 177 460 000 | 17 746 000 |
| 23 | 91 | 2 | 6 | 3 | 55,0 | 31,1 | 138 050 000 | 13 805 000 |
| 24 | 92 | 3 | 6 | 3 | 76,2 | 46,6 | 191 270 000 | 19 127 000 |
| 25 | 93 | 4 | 7 | 3 | 90,1 | 58,9 | 226 160 000 | 22 616 000 |
| 26 | 94 | 3 | 7 | 3 | 70,8 | 43,3 | 177 710 000 | 17 771 000 |
| 27 | 95 | 2 | 7 | 3 | 54,9 | 31,1 | 137 800 000 | 13 780 000 |
| 28 | 96 | 3 | 7 | 3 | 76,4 | 46,7 | 191 770 000 | 19 177 000 |
| 29 | 97 | 4 | 8 | 3 | 90,1 | 58,8 | 226 160 000 | 22 616 000 |
| 30 | 98 | 3 | 8 | 3 | 70,7 | 43,2 | 177 460 000 | 17 746 000 |
| 31 | 99 | 2 | 8 | 3 | 54,6 | 30,9 | 137 050 000 | 13 705 000 |
| 32 | 100 | 3 | 8 | 3 | 76,1 | 46,5 | 191 020 000 | 19 102 000 |

1) Аукцион состоится **7 мая 2009 г.** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5 (КЗ «Минск», 3-й этаж, малый зал, ауд. 310), регистрация участников — в 10.00.

2) К участию в аукционе допускаются физические лица — граждане Республики Беларусь.

3) Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы в УП «Минский городской центр недвижимости»: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом; соглашение о правах и обязанностях сторон; ксерокопию паспорта; заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены; б) платы за регистрацию в размере 1/4 минимальной заработной платы (57 430 руб.).

Оплата осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО БПС-Банк по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Квартиры продаются только для использования под жилье. Граждане, выигравшие торги, обязаны вступить в товарищество собственников. Договор купли-продажи квартир с гражданами должен быть нотариально удостоверен и зарегистрирован в Республиканском унитарном предприятии «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Расходы, связанные с совершением нотариальных действий и государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем аукциона.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации организатором аукциона отказа от участия в аукционе по письменному заявлению участника аукциона на лицевой его счет с указанием полных банковских реквизитов для возврата денежных средств (задатка).

Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

При подаче документов на участие в аукционе физическое лицо предъявляет паспорт, его представитель — паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально.

Все участники аукциона перед подачей заявления на участие в торгах должны детально ознакомиться с утвержденными Условиями проведения аукциона и объектом.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе квартир осуществляется в установленном для физических лиц порядке по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 15 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона на расчетный счет продавца. Договор купли-продажи квартир подписывается в течение 15 календарных дней со дня истечения срока, отведенного для оплаты, при условии внесения победителем полной оплаты за квартиру и оплаты за подготовку и проведение торгов организатору аукциона УП «Минский городской центр недвижимости».

Победитель аукциона помимо оплаты за объект обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах, произвести оплату услуг организатору аукциона сверх цены продажи в размере 1 % от окончательной стоимости квартиры.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются с 21 апреля 2009 г. по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 в понедельник – четверг с 8.45 до 18.00, в пятницу с 8.45 до 16.45 по 6 мая 2009 г. до 17.00 включительно. (Перерыв на обед: с 13.00 до 14.00). **Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by. Осмотр квартир проводится с 21 апреля 2009 г. по вторникам и четвергам в присутствии сотрудников МАПИД с 14.00 до 16.00 по адресу: ул.Тимирязева, 92. Телефоны для справок: 207 19 15; 208 58 12. Интернет: www.mapid.by.**

УНП 190398583

Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 14 мая 2009 года

**Открытое акционерное общество «МАПИД» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартир без отделки в доме № 40 по ул. Янковского в г. Минске**

| № лота | Наименование объекта: № квартиры | количество комнат | этаж | Площадь, кв.м: общая | жилая | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 14 | 1 | 3 | 43,1 | 18,0 | 112 060 000 | 11 206 000 |
| 2 | 22 | 2 | 4 | 57,6 | 31,0 | 149 760 000 | 14 976 000 |
| 3 | 30 | 1 | 5 | 43,1 | 18,0 | 112 060 000 | 11 206 000 |
| 4 | 38 | 2 | 6 | 57,7 | 31,0 | 150 020 000 | 15 002 000 |
| 5 | 46 | 1 | 7 | 43,2 | 18,0 | 112 320 000 | 11 232 000 |
| 6 | 54 | 3 | 8 | 75,1 | 45,1 | 195 260 000 | 19 526 000 |
| 7 | 60 | 1 | 9 | 42,9 | 18,0 | 111 540 000 | 11 154 000 |
| 8 | 66 | 2 | 10 | 57,3 | 31,0 | 148 980 000 | 14 898 000 |
| 9 | 68 | 3 | 10 | 74,8 | 45,1 | 194 480 000 | 19 448 000 |
| 10 | 72 | 1 | 11 | 43,0 | 18,0 | 111 800 000 | 11 180 000 |
| 11 | 76 | 2 | 12 | 57,3 | 30,9 | 148 980 000 | 14 898 000 |
| 12 | 78 | 2 | 12 | 57,7 | 31,2 | 150 020 000 | 15 002 000 |
| 13 | 84 | 1 | 13 | 42,9 | 18,0 | 111 540 000 | 11 154 000 |
| 14 | 90 | 2 | 14 | 57,5 | 31,1 | 149 500 000 | 14 950 000 |
| 15 | 92 | 2 | 14 | 57,5 | 31,1 | 149 500 000 | 14 950 000 |
| 16 | 98 | 1 | 15 | 42,8 | 18,0 | 111 280 000 | 11 128 000 |
| 17 | 100 | 1 | 15 | 42,8 | 17,9 | 111 280 000 | 11 128 000 |
| 18 | 106 | 2 | 16 | 57,4 | 31,0 | 149 240 000 | 14 924 000 |
| 19 | 108 | 2 | 16 | 57,6 | 31,1 | 149 760 000 | 14 976 000 |
| 20 | 114 | 1 | 17 | 43,0 | 18,0 | 111 800 000 | 11 180 000 |
| 21 | 116 | 1 | 17 | 42,7 | 17,9 | 111 020 000 | 11 102 000 |
| 22 | 118 | 2 | 18 | 57,5 | 31,1 | 149 500 000 | 14 950 000 |
| 23 | 122 | 2 | 18 | 57,4 | 31,0 | 149 240 000 | 14 924 000 |
| 24 | 124 | 3 | 18 | 74,7 | 45,0 | 194 220 000 | 19 422 000 |
| 25 | 130 | 1 | 19 | 42,9 | 18,0 | 111 540 000 | 11 154 000 |

1) Аукцион состоится **14 мая 2009 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5 (КЗ «Минск», 3-й этаж, малый зал, ауд. 310), регистрация участников — в 10.00.

2) К участию в аукционе допускаются физические лица — граждане Республики Беларусь.

3) Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы в УП «Минский городской центр недвижимости»: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом; соглашение о правах и обязанностях сторон; ксерокопию паспорта; заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены; б) платы за регистрацию в размере 1/4 минимальной заработной платы (57 430 руб.).

Оплата осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО БПС-Банк по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Квартиры продаются только для использования под жилье. Граждане, выигравшие торги, обязаны вступить в товарищество собственников. Договор купли-продажи квартир с гражданами должен быть нотариально удостоверен и зарегистрирован в Республиканском унитарном предприятии «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Расходы, связанные с совершением нотариальных действий и государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем аукциона.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации организатором аукциона отказа от участия в аукционе по письменному заявлению участника аукциона на лицевой его счет с указанием полных банковских реквизитов для возврата денежных средств (задатка).

Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

При подаче документов на участие в аукционе физическое лицо предъявляет паспорт, его представитель — паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально.

Все участники аукциона перед подачей заявления на участие в торгах должны детально ознакомиться с утвержденными Условиями проведения аукциона и объектом.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе квартир осуществляется в установленном для физических лиц порядке по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 15 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона на расчетный счет продавца. Договор купли-продажи квартир подписывается в течение 15 календарных дней со дня истечения срока, отведенного для оплаты, при условии внесения победителем полной оплаты за квартиру и оплаты за подготовку и проведение торгов организатору аукциона УП «Минский городской центр недвижимости».

Победитель аукциона помимо оплаты за объект обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах, произвести оплату услуг организатору аукциона сверх цены продажи в размере 1 % от окончательной стоимости квартиры.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются с 4 мая 2009 г. по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 в понедельник – четверг с 8.45 до 18.00, в пятницу с 8.45 до 16.45 по 13 мая 2009 г. до 16.00 включительно. (Перерыв на обед: с 13.00 до 14.00). **Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by. Осмотр квартир проводится с 4 мая 2009 г. по понедельникам и средам в присутствии сотрудников МАПИД с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Янковского, 40. Телефоны для справок: 207 19 15; 208 58 12. Интернет: www.mapid.by.**

УНП 190398583

